крыжакоў. пакуль не здарылася, пасля неабходнай падрыхтоўкі, вялікая бітва паміж Тэўтонскім ордэнам рыцараў-крыжакоў аднаго боку, і Польшчы і ВКЛ-з другога.

"І пачалася бітва паміж немцамі і польска- літоўскімі войскамі і шматлікая колькасць воінаў з абодвух бакоў загінула" – сцвярджаецца ў хроніцы Быхаўца. К зыходу дня 15 ліпеня 1410 года бітва пад Грунвальдам скончылася ўзяццем польскай і літоўскай пяхотай Валенбурга ля Грунвальда Тэўтонскі ордэн быў разгромлены. Пасля сакрушальнага разгрому ордэнскага войска пачаліся перамовы аб міры. Першага лютага 1411 года ў Торуні ён быў заключаны. Набегам нямецкіх рыцараў на нашi землі быў фактычна пакладзены канец.

След гэтай бітвы мае вайскавы, палітычны і эканамічны аспект. Вайсковае значэнне грунтуецца ў ваенна-баевым майстэрстве нашых продкаў-ваяроў, іх патрыятызме і самаахвярнасці ў імя сваёй радзімы. У эканамічным жыцці вялікага Княства адбыліся станоўчыя зрухі ў выніку адкрытых шляхоў, праз Балтыйскае мора да еўрапейскіх гандлёвых гарадоў , што паўплывала на гаспадарчае жыццё княжацкіх тэрыторый.

Перамога пад Грунвальдам мела далёкасяжныя наступствы. Пяцьсот гадоў боты нямецкіх салдат не ступалі на нашы беларускіе землі – да самай Першай сусветнай вайны.

УДК 940. 3/. 4 + 325. 8 (476)

## Деятельность Белорусского общества в Петрограде по оказанию помощи пострадавшим от войны (1916-1918 гг.)

Щавлинский Н.Б.
Белорусский национальный технический университет

Первая мировая война, начавшаяся в августе 1914 г. породила такую проблему как беженство. По сведениям белорусского историка количество беженцев из белорусских губерний на 1 января 1917 г. составило более 1,3 млн. человек. основная часть которых осела в центральных губерниях России и Поволжья.

Во многих российских городах - Петрограде, Саратове, Казани, Ярославле, Самаре и др. – были созданы белорусские беженские комитеты, где проводилась национально-культурная работа.

Одной из самых активных беженских организаций было созданное в январе 1916 г. Белорусское общество в Петрограде по оказанию помощи пострадавшим от войны. Ее организаторами и руководителями были такие деятели белорусского возрожденческого движения, как Б.Эпимах-Шыпило, Зм.Жилунович, Э.Будько, Я.Кавецкая и др. Общество оказывало

помощь деньгами и предметами, открывало интернаты для белорусских студентов и учащихся, детские приюты, издавало листовки с призывом пожертвовать денежные средства для белорусских беженцев, которых в Петрограде в конце 1916 г. насчитывалось 100704 человека.

Пытаясь объединить разрозненные беженские организации, приобщить их к национально-культурной работе, руководство Белорусского общества в Петрограде по оказанию помощи жертвам от войны наладило в октябре 1916 г. издание газет «Дзянніца» и «Светоч».

Однако в скором времени против проявления белорусского национального движения выступили реакционные силы России, и в конце 1916 г. издание газет было приостановлено. А после установления на не оккупированной территории Беларуси и в России Советской власти Белорусское общество в Петрограде помощи жертвам от войны в декабре 1917 г. приостановило свою деятельность.

УДК 39-053.2

## Паняцце сацыяльнага ўзросту ў традыцыйных шлюбна-сямейных адносінах

Якубінская А. Дз.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Развіццё традыцыйнага грамадства можна ўявіць як працэс паслядоўнай пераемнасці пакаленняў. Пераход да новай ўзроставай ступені суправаджаецца пэўнымі абрадавымі дзеяннямі і зменамі ў абавязках і сацыяльным статусе індывіда. У традыцыйным грамадстве дасягненне пэўнага біялагічнага ўзросту супадае з новым сацыяльным ўзростам. Сацыяльны ўзрост – комплекс нарматыўных характарыстык, якія ўзнікаюць на аснове ўзроставага падзелу працы і сацыяльнай структуры грамадства. У традыцыйным грамадстве сацыяльная іерархія вызначалася нормамі табу, напрыклад сэксуальныя, харчовыя забароны, табу на вопратку. Навуковую цікавасць уяўляе вылучэнне пэўных культурных этапаў сацыяльнага ўзросту. Цыкл жыцця асобы паўтараецца: дзеці навучаюцца ў старэйшых дзяцей, потым актыўна дзейнічаюць з імі ў адной суполцы, пры гэтым выхоўваючы малодшых. Шлюб – гэта рух па сацыяльнай іерархіі і пераход у больш высокую ўзроставую і сацыяльную ступень. Адна з праблем, што ставіцца ў сучаснай антрапалогіі – гэта праблема дастаткова вялікага разрыву ў шлюбным узросце мужчын і жанчын. Шлюбны ўзрост жанчыны ў традыцыйным грамадстве вызначаецца яе біялагічным выспяваннем, наступленнем перыяду фертыльнасці. У той час як мужчына бярэ шлюб значна пазней. Існуе